На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№ 69 (191)

Субота, 19 красавіка 1997 г.

Выдаецца
на беларускай і рускай мовах

Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

Сонца	Усход	Заход
Віцебск	5.47	20.11
Магілёў	5.50	20.07
Гомель	5.50	20.00
Мінск	6.00	20.17
Гродна	6.16	20.30
Брэст	6.21	20.29

И в Сеуле оконфузились

Ах, сколько было умильной радости на лицах руководителей Национального собрания Беларуси, когда они, торжествуя и блаженствуя, изрекали перед камерами и микрофонами родного радио и телевидения: глядите, нас же признает мировое сообщество. А чтобы ни у кого не закрались сомнения и для пущей важности, показывали приглашение на участие в 97-й конференции Межпарламентской ассамблеи, которая проводится в середине апреля в Сеуле.

Приказали Министерству финансов, и то послушно выделило немалую сумму долларов на командировочные расходы. Да и как же иначе — не на экскурсию летят, а на заседание авторитетнейшей международной организации.

Тамару Дудко — заместителя председателя верхней палаты Национального собрания, она же глава делегации, напутствовали: смотри, Тамара, не подкачай. Если будут очень докучать с вопросами, помни, у нас демократия и вообще полный порядок...

Провожающие как в воду глядели. Участники форума (конечно же, по наущению врагов белорусского президента) вдруг почему-то захотели разобраться — кого же представляет в Сеуле белорусская делегация. А разобравшись, приняли решение — приостановить членство Беларуси в Межпарламентской ассамблее, поскольку "формирование Национального собрания Республики Беларусь не соответствует демократическим принципам".

Обиженная госпожа Дудко бросилась искать защиты. У кого? Что за странный вопрос. Конечно же, у российских товарищей. И Александр Дзасохов, в прошлом известный коммунистический деятель, а ныне заместитель Егора Строева по Федеральному собранию Российской Федерации и глава российской делегации, настоял, чтобы "белорусский вопрос" был рассмотрен вторично. Совет Межпарламентской ассамблеи прислушался к пожеланию и на своем заседании еще раз вернулся к белорусской теме. Но, к глубокому огорчению Тамары Дудко и ее московских покровителей, члены совета оставили решение ассамблеи в силе.

Это уже второй очень неприятный щелчок по самолюбию белорусских официальных властей. Первый раз, напомню, они оскандалились в Вене, где законным представителем Беларуси в ОБСЕ признали не Национальное собрание, а Верховный Совет 13-го созыва. И вот новый конфуз — на этот раз в далеком Сеуле.

Владимир ГЛОД.

Форумы

Повестка дня на 21-й век для всей планеты

Три дня в столице республики работала Международная конференция по устойчивому развитию стран с переходной экономикой. На форум в концертном зале "Минск" на улице Октябрьской, 5 собрались представители тридцати стран мира. Его участников приветствовал президент страны А.Лукашенко.

По мнению заместителя генерального секретаря ООН господина И.Бертело, которое он высказал на недавней пресс-конференции, Беларусь достигла определенных успехов в выработке национальной стратегии. Концепция, уже утвержденная Советом министров, охватывает период до 2000 года и представляет собой попытку гармонизации отношений между человеком и природой, властью и гражданским обществом, различными группами населения.

Подобная проблема стоит практически перед всеми странами СНГ и Балтии. Эстония, к примеру, уже приняла закон, профилактирующий экологические, социальные, политические катаклизмы. В России на основе такого рода концепции издан указ президента. Беларусь довольно близко подошла к тому, чтобы сделать стратегию рабочим инструментом, во многом опередив другие постсоветские государства. Об этом доложил участникам представительного форума министр природных ресурсов и охраны окружающей среды республики М.Русый.

Организация Объединенных Наций имеет богатый опыт помощи странам с переходной экономикой. Сотрудничая с Беларусью, влиятельная международная организация учитывает и столь особую проблему, как преодоление последствий чернобыльской катастрофы, и для помощи в этом направлении старается изыскивать дополнительные ресурсы.

События этих апрельских дней в Минске восходят к конференции ООН по окружающей среде и развитию, которая состоялась пять лет назад в Рио-де-Жанейро. Нынешняя, региональная, минская, является одним из этапов подготовки специальной сессии Генеральной ассамблеи ООН, на которой предполагается сделать всеобъемлющий обзор того, как за прошедшее пятилетие совместными усилиями удалось выполнить глобальную и актуальную для всей планеты "Повестку дня на 21-й век".

Людмила ВАЛЕНТИНОВА.

Мнение читателя

А я хочу объединиться с Польшей

Уважаемая редакция "Народной воли"! Читая, слушая и просматривая информацию о нашем положении в Беларуси, нельзя оставаться безучастным по отношению к происходящему даже мне, рядовому человеку. По словам президента и государственных средств массовой информации, мы все стремимся к политическому союзу с Россией. Но это не так. Мы, жители Западной Беларуси, помним оккупацию нашего края советскими войсками в 1939 году.

Мы были свидетелями, как происходило уничтожение нации, культуры и религии. Теперь история повторяется.

В Западной Беларуси проживают, в основном, католики, которые хотят союза с Польшей, Литвой, Западом. Нас почти третья часть всего населения Беларуси. Поэтому, коль так случилось, что Беларусь не может быть нашей, мы предлагаем через международные организации провести референдум. Хочет Лукашенко и могилевчане — пусть объединяются с Россией. А мы, жители Гродненской, Брестской, отдельных районов Витебской областей, хотим объединения с явно прогрессирующей Польшей. Позвольте нам сделать это мирным, демократическим путем. Мы хотим видеть наш край процветающим.

**Антон ДИСЬКО,
житель п.Лынтупы
Поставского района.**

***От редакции.** Вот такой неожиданный голос влился в дискуссию о российско-белорусском Союзе. Впрочем, неожиданный ли? "Польский фактор" в жизни белорусов достаточно ощутим и в историческом, и в современном смысле. Во всяком случае, письмо нашего читателя свидетельствует о неоднозначности настроений в нашем обществе, с которым, безусловно, нужно считаться и президенту Лукашенко, и другим "интеграторам" — как с белорусской, так и с российской стороны.*

Демократия по-белорусски

Судья Нелли Ройник без церемоний выставила за дверь представителя миссии ОБСЕ Бъерна Крога Андерсена

**Людмила МАСЛЮКОВА,
политический обозреватель "Народной воли"**

В Партизанском суде города Минска 17 апреля продолжился процесс над первым заместителем председателя Верховного Совета 13-го созыва Василием Новиковым. Обвинение все то же: ходил по проспекту Скорины вместе с тысячами других демонстрантов в День Конституции 15 марта 1997 года. 27 марта судья Нелли Ройник вернула дело об административном нарушении в Партизанский РОВД, так как неграмотно и небрежно был составлен милицейский протокол, уличавший депутата. На основе документа, переписанного набело и как должно, развивался процесс далее, стремительно приближаясь к логическому завершению.

В эти дни в столице Беларуси работала группа представителей ОБСЕ. Один из ее членов, Бъерн Крог Андерсен, выразил желание поприсутствовать в суде над первым вице-спикером. Прежде он, сотрудник Королевского Посольства Дании в Москве, слышал заверение министра иностранных дел республики Ивана Антоновича в том, что правосудие по гражданским процессам в Беларуси осуществляется гласно и открыто. Однако в реальности датчанин столкнулся как раз с противоположным.

Господин Андерсен толпился вместе с остальной публикой перед дверью кабинета судьи Нелли Ройник, где шло заседание в присутствии двух допущенных на процесс журналистов. Она сразу же отклонила ходатайство Василия Новикова о допуске в кабинет представителя миссии ОБСЕ. Однако последний не поверил, что ему не удастся наблюдать событие, и предпринял попытку проникнуть в святилище.

Перед непреклонным рядовым белорусским судьей уполномоченный авторитетнейшей в мире международной организации, пришедший в волнение от необычной для него ситуации, смог произнести лишь две фразы на русском языке: "Мне нельзя? Мне идти?". И он, без церемоний выставленный за дверь, вышел к другим гражданам Беларуси, не допущенным на "открытый" и "гласный" процесс. С глубоким искренним недоумением посланец просвещенной Европы удалился из здания суда Партизанского района. На собственном опыте он убедился в том, о чем неоднократно слышал от представителей оппозиции: власти Беларуси лишь говорят о демократии, но на каждом шагу практически пренебрегают ею.

Эксперт ОБСЕ так и не увидел демократию по-белорусски в действии. Напрасно заявлял ходатайства суду адвокат Василия Новикова. Все, что ни предлагал вниманию судьи Гарри Погоняйло, она отметала, мотивируя тем, что все это не имеет отношения к рассматриваемому делу. Она лишь досадовала на изрядный шум за запертой дверью и дважды посылала секретаря суда на... ликвидацию помех в коридоре. "Там достаточно работников милиции, чтобы успокоить граждан", — напутствовала судья подчиненную.

Нелли Ройник вынесла постановление, которое обязывает не признавшего свою вину Василия Новикова выплатить штраф в доход державы в размере 5-ти миллионов рублей. Вот в такую копеечку влетел первому вице-спикеру государственный праздник — День Конституции. Такое решение суда держится на трех "китах". Первый их них — подневольные милицейские протоколы и свидетельства. Второй — антидемократический указ президента N 5 об ограничении прав граждан на свободу собраний, демонстраций, шествий. Третий — противозаконная санкция Генерального прокурора на привлечение к административной ответственности депутата Василия Новикова.

Жаль, в самом деле, что всю экзотику белорусского правосудия не смог воочию и по достоинству оценить Бъерн Крог Андерсен. Впрочем, у него и у других членов миссии ОБСЕ еще оставался шанс удовлетворить любопытство. На следующий день, 18 апреля, в Центральном суде Минска начинался аналогичный процесс над председателем Верховного Совета 13-го созыва Семеном Шарецким...

Абмяркоўваем праект Статута Саюза Беларусі і Расіі

Дубінкай па спіне таму, хто не згодзен. Хіба можна чакаць дабра ад такой "інтэграцыі"?

Я нічога не маю супраць эканамічнай інтэграцыі з любой дзяржавай, у тым ліку і з Расіяй, але ніяк не магу зразумець, навошта размовамі аб ёй падмяняць палітычнае аб'яднанне. Навошта Беларусі аддаваць права распараджацца сваім бюджэтам Маскве? Навошта лезці ў капкан пад назвай "Расійская Федэрацыя", з якога нашым дзецям прыйдзецца вырывацца як чэчэнцам? Паглядзіце, што стала з Грозным. Вы хочаце, каб так было і з Мінскам?

У апошні час Лукашэнка сцвярджае, што ён захавае суверэнітэт Беларусі. Але яго ж памкненні да адзінай валюты, агульнага грамадзянства і г.д. выдаюць яго з галавой. Якая ж гэта дзяржава, калі не мае ўласных грошай?

Нам усё гавораць аб тым, што вунь Заходняя ж Еўропа аб'ядноўваецца. Але ж наша "саўковая інтэграцыя" так адрозніваецца ад еўрапейскай, як магілёўскі калгас ад іхніх фермерскіх гаспадарак. Да таго ж у Еўрапейскую супольнасць нікога не заганялі дубінкамі. І ў НАТО — таксама. Туды чарга. Кажуць, Еўропа аб'ядноўваецца. Дык давайце і мы будзем аб'ядноўвацца з багатай Еўропай, а не з гэтай усходняй галыцьбой!

Іван ХАЦКЕВІЧ.

Мінскі раён.

Глядзіце, абдураць беларусаў...

Што ж гэта за інтэграцыя, ды яшчэ дабравольная, калі ўсіх, хто хоча выказаць сваю нязгоду, збіваюць дубінкамі? Браткі-беларусы, апамятайцеся, паглядзіце, куды нас піхаюць, успомніце пра сваю чалавечую годнасць і свядомасць. Нават расійскія ястрабы, якія гарой за далучэнне Беларусі, і тыя пераконваюць, што нельга так рабіць, як прапаноўваецца, што ўваходжанне Беларусі ў састаў Расіі, гэта "унижение, которое не выдержит любой народ", а таму, маўляў, трэба гэты акт неяк прыгажэй афарміць. Словам, каб прыгажэй абдурыць беларусаў.

Павел БУРДЫКА.

Полацк.

Нам што, Чарнобыля мала?

Днямі слухаў разважанні па расійскаму тэлебачанню маскоўскіх прыхільнікаў аб'яднання Беларусі з Расіяй. Гэта наш адказ НАТО, даказваў адзін палітык, яны пашыраюцца, і мы пашыраемся. Яны змогуць бліжэй паставіць ракеты да Масквы, і мы да іх.

Вось яно што! Беларусь збіраюцца ператварыць у ядзерную пляцоўку супраць Еўропы. Нам што, Чарнобыля мала? Трэба яшчэ каля кожнай вёскі наставіць гэтай смертаноснай зброі? Вось што хаваецца за разглагольствамі аб інтэграцыі.

Сямён КРАСЕВІЧ.

Мінск.

Чулі?

Энцыклапедыя беларускай культуры. Электронная

Цікавы праект рыхтуецца ў Беларускім інстытуце праблем культуры. Яго навукоўцы задумалі зрабіць электронную энцыклапедыю беларускай культуры.

Усю інфармацыю стане магчымым атрымліваць з лазерных дыскаў, дзе акрамя тэксту будуць змешчаны кінафотаматэрыялы, слайды, фрагменты выступленняў нашых вядомых народных калектываў і іншы цікавы матэрыял.

Першыя два дыскі ўжо амаль падрыхтаваныя, і ўбачаць свет, як спадзяюцца супрацоўнікі інстытута, у гэтым годзе. Першы змяшчае інфармацыю пра беларускія строі, нацыянальныя касцюмы, другі — пра беларускі культ і ўсё, што датычыцца іканапісу Беларусі.

Марыя ВІКТАРАВА.

Чего же нам ждать?

В преддверии празднования 50-летия победы в Великой Отечественной войне президентами России и Беларуси было на весь мир объявлено, что значительно улучшится материальное положение инвалидов войны, будет обеспечен один раз в год бесплатный проезд из Беларуси в Россию и обратно.

Прошло два года. В России Ельцин увеличил пенсии инвалидам войны в два раза и выдал бесплатные проездные талоны. В Беларуси же жизнь инвалидов жалка и невыносима. А на талоны существует только 50-процентная скидка. И дело не только в их стоимости, а в том, что мы уже никуда не поедем, потому что 80 процентов из нас — лежачие больные. Чего же нам ждать?

По поручению группы инвалидов города Барановичи — Владимир ЖИТКОВ, инвалид Великой Отечественной войны второй группы.

У полацкіх газетчыкаў – свята

17 красавіка супрацоўнікі газеты "Полацкі веснік" і іх чытачы адзначылі вялікае свята. Роўна 80 гадоў таму, 17 красавіка 1917 года, у Полацку пабачыла свет першая мясцовая газета. Называлася яна "Революционный голос".

Пасля гэтага газета неаднаразова змяняла сваю назву, адлюстроўваючы падзеі тагачаснай гісторыі. У прыватнасці, яе ведалі як "Известия", "Октябрьское эхо", "Красная газета", "Красное знамя", "Красный пахарь"...

А ў 1926 годзе газета пачала выходзіць на роднай мове, узяўшы новае імя — "Чырвоная Полаччына". У ёй пачыналі працаваць Пятрусь Броўка, Тарас Хадкевіч, Сцяпан Александровіч, Алесь Звонак ды іншыя добра вядомыя майстры беларускага слова.

Нават у гады Вялікай Айчыннай вайны выдаваўся ў падполлі спецыяльны выпуск газеты, якая ў той час ужо мела новую назву — "Бальшавіцкі шлях". І далей у сваіх назвах газета адлюстроўвала прыкметы часу — "Сталінскі шлях", "Сцяг камунізму". Пад апошняй назвай газета існавала да 1991 года і была добра вядомая сярод жыхароў Полаччыны.

У апошні раз змяніўшы імя і пачаўшы выходзіць як "Полацкі веснік", газета не адмовілася ад роднай мовы. І хаця той-сёй з гарадскіх чыноўнікаў і націскае на рэдакцыю, маўляў, трэба пераходзіць на рускую мову, калектыў трымаецца. Мясцовыя жыхары добра ведаюць — два разы на тыдзень яны атрымаюць сваю любімую газету.

Зразумела, што юбіляры атрымалі шмат віншаванняў. Да іх далучыўся і прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання.

Уладзімір КОТ.

P.S. *Рэдакцыя "Народнай волі" шле калегам "Полацкага весніка" шчырае прывітанне і зычыць плённага натхнення ў дасягненні творчых мэт.*

Ёсць прапанова!

Ушануем памяць Льва Сапегі

Дарагая рэдакцыя газеты "Народная воля"!

Нядаўна нацыянальна свядомая грамадскасць рэспублікі адзначыла 440-годдзе з дня нараджэння выдатнага беларускага дзеяча Льва Сапегі.

Канцлер Вялікага Княства Літоўскага Леў Сапега — аўтар Статута Княства 1588 года, па сутнасці — першай беларускай Канстытуцыі, якая вядомая далёка за межамі нашай краіны.

Што і казаць, нашай Айчыне можна толькі ганарыцца такім слаўным сынам. І святы абавязак суайчыннікаў — ушанаваць яго памяць. Але чамусці ў сталіцы Беларусі няма нават вуліцы Льва Сапегі. Прапаную назваць імем гэтага выдатнейшага дзеяча вуліцу, якая носіць цяпер імя Ландэра. Трэба як мага хутчэй пазбаўляцца ад імёнаў, звязаных з таталітарным мінулым.

І яшчэ шэраг прапаноў. Прапаную таксама перайменаваць вуліцу Розы Люксембург у вуліцу Прадславы, вуліцу Карла Лібкнехта — у вуліцу Усяслава Чарадзея, вуліцу Клары Цэткін — у вуліцу Ефрасінні Полацкай, вуліцу Будзённага — у вуліцу Давіда Гарадзенскага, вуліцу Цімашэнкі — у вуліцу Канстанціна Астрожскага, вуліцу Берута — у вуліцу Алеся Гаруна, плошчу Парыжскай Камуны — у Траецкую плошчу.

Сяргей ГЕРАСІМЧЫК.

Мінск.

Из первых уст

Известие о гибели Джохара Дудаева пришлось скрывать и от своих

Ее ожидали также в Минске. Но в столицу Беларуси она не прибыла — остановилась в соседнем Вильнюсе. Вдова известного генерала Алла Дудаева вручила чеченский орден Оне Велавичене, матери литовца Линаса Велавичюса, убитого в 1995 году в Чечне.

Алла Дудаева дала интервью корреспонденту "Летувос ритаса", которое, считаем, будет интересно и для читателей "Народной воли".

— Что вас привело в Литву?

— Две причины. Во-первых, мы привезли орден, которым посмертно награжден литовский доброволец Линас Велавичюс. Вторая цель — учредить в Литве фонд для содержания детского дома в Джохаргале (Грозный). Я бы также хотела, чтобы при вильнюсском университете было открыто отделение, где бы наша молодежь на русском языке могла изучать международные отношения. Хочу учредить стипендию имени Джохара Дудаева.

— Вернемся немного назад. Расскажите, как вы встретились с Джохаром Дудаевым.

— Я была студенткой-второкурсницей художественного факультета. На каникулы приехала к родителям. А Джохара после Тамбовского авиационного училища направили в маленький городок в Калужской области. Как-то раз я пошла на танцы. Туда пришел и Джохар. Он пригласил меня потанцевать. Представляясь, назвал все свои воинские звания и должности, рассказал о генеалогическом древе до десятого колена. Он мне показался оригиналом. Вместе провели целый вечер. Он назначил свидание на следующий день. Так мы и встречались два с половиной года. Я вышла за него замуж, когда была на последнем курсе.

— Д.Дудаев стал президентом Чечни. Когда ваше присутствие было для него наиболее необходимо?

— Рядом я была все пять лет его президентства. На мой взгляд, жена с мужем неразделимы. Его заботы — это и ее заботы. С первого же года я полностью взяла на себя дом. Занималась приготовлением пищи для президента, его охраны, его гостей. А надо сказать, нам пытались навязать людей, которые могли его отравить. Как потом выяснилось, одна секретарша оказалась из преступного мира. Она едва не отравила Джохара кофе. Только тогда мы поняли, что она из себя представляет. Наша жизнь была трудной и опасной. Я полагалась только на родственников.

Меня часто снимали для телевидения — я читала стихи, давала интервью. Писала картины, организовала выставку.

Много приходилось встречаться с людьми: ко мне обращались за помощью, когда президента не было дома.

Я старалась, насколько возможно, оградить мужа от большого наплыва людей, решать их проблемы, отправляла при необходимости к министрам.

В годы войны я наиболее остро почувствовала, что нужна ему. Мне казалось, что ему будет намного легче, если он в боях и под бомбами сможет видеть лицо родного и близкого человека.

— Кто являлся для Д.Дудаева авторитетом?

— Часто бывало так, что люди, которых он раньше уважал, теряли в его глазах авторитет.

— Из-за предательства?

— Да. А авторитеты были. В Германии сейчас живет и собирается вернуться на родину чеченский писатель, публицист, историк А.Авторханов, человек весьма преклонного возраста, в прошлом — диссидент. Из России ему пришлось иммигрировать. Он часто писал Джохару. Я читала все его



Алла Дудаева в первые дни после гибели мужа.

письма, присланные до гибели Джохара. Читала и письма В.Новодворской, и Е.Боннэр. Это были его авторитеты.

Особенное впечатление произвело последнее, мартовское, письмо А.Авторханова. В нем он говорит о своем предчувствии того, что больше не увидит Джохара. А.Авторханов думал, что это он умрет, считал письмо прощальными. Президент положил его в нагрудный карман, носил у сердца. С тем письмом он и погиб.

— Какие дни были для вас самые счастливые?

— Пожалуй, самыми счастливыми были дни рождения моих детей. Их трое — сыновья и дочь. Сейчас у детей уже есть свои дети, а у меня четыре внука и одна внучка. Когда они родились, я была счастлива. А Джохар радовался еще больше. Когда я услышала первый крик родившегося ребенка, я плакала от радости.

Счастье пережила, когда защитники Грозного победили. От радости плакала.

— Вспомним и самые трудные дни.

— Таких было много. Прежде всего, первое покушение — 27 мая 1994 года, совсем накануне войны. Мы ехали в колонне машин. Я сидела в шестой, Дуки, то есть Джохар, — в третьей, Деги, наш младший сын, — в первой. И вдруг взорвалась вторая машина с толом. Ничего не осталось. Говорят, что там было 200 килограммов взрывчатки. Я лишь успела увидеть стену огня в полнеба. Машины остановились, Дуки вместе с охраной выскочил, началась стрельба. А я окаменела от ужаса: думала, что сын сидел во второй машине.

Были страшные дни, когда на нас с президентом устроили охоту, целя на телефонный сигнал. Это было в Шалажи. Дважды наш дом бомбили. По соседству буквально снесло две улицы. А наш дом, похоже, Бог хранил.

Самое страшное воспоминание — последний ракетный удар и гибель президента. Мы знали, что они "держат на мушке" наш номер. Разговаривать по телефону мы выезжали из дома туда, где только что взорвались бомбы. Есть примета: дважды в одно место снаряд не падает. Джохар стал набирать номер. Он предполагал, что вскоре должна появиться "утка". Так мы называли самолет с радаром. Бомбардировщики прилетали позже.

Через полчаса услышали гул тяжелого самолета. Укрылись в лесу. Джохар сказал, что теперь у него есть полчаса, а 20 минут он точно может говорить по телефону. Мы выбрались из леса. Вот тогда-то все и произошло.

В тот роковой вечер мы ехали на двух машинах. С нами были Вахо Ибрагимов, бывший помощник и советник Д.Дудаева, Магомет Джаниев — генеральный прокурор, Хамат Курбанов — бывший представитель Чечни в Москве. Стояла весна, появлялись первые цветы. Мы остановились под горой, внизу открывалась долина.

Заявление для радио "Свобода" начал читать Вахо Ибрагимов. Мне Джохар велел отойти в сторону. Мы, несколько человек, отошли метров на 12—15.

(Окончание на 2-й стр.)

Народная воля

19 КРАСАВІКА 1997 г.

Известие о гибели Джохара Дудаева пришлось скрывать и от своих

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Солнце клонилось к закату. Было около семи вечера по московскому времени. Где-то высоко в горах громко пели птицы. Мне вдруг почудилось, что какая-то из них надрывно рыдает.

Это было словно предзнаменование! Птицы уже дважды спасали Джохара. Первый раз в Шатое. Две птички разыгрались прямо на пороге дома. Потом, поглядывая на Джохара, стали удаляться. Очарованный их игрой, он прошел за ними метров 50, как вдруг за спиной раздался мощный взрыв: в дом угодила ракета.

В другой раз Джохар и его охрана были в какой-то деревне. В комнату залетели ласточки и принялись описывать круги под потолком. Они то отлетали, то вновь возвращались. Джохар сказал: "Наверное, кто-нибудь разорил их гнездо, пойдем посмотрим", — и все направились за ласточками к гаражам. В это время прогремел взрыв. От дома ничего не осталось.

Вот и в тот раз меня поразили рыдания птицы на фоне веселого щебета остальных. Вахо отошел в сторону, и минуты через две-три у меня за спиной раздался взрыв. Это явно разорвалась ракета, потому что от бомбы языки пламени бывают мощнее.

Меня отшвырнуло взрывной волной, но я ухватилась за какую-то ветку. Подняв голову, увидела: вокруг — никого. Там, где только что стояла "Нива" и весело беседовал с друзьями Дуки, не было ни его, ни машины, ни Вахо. Подумалось было: вот молодцы, успели укрыться. Но тут снова раздался взрыв.

Меня сбил с ног телохранитель и велел не поднимать голову. Потом он куда-то рванул, а минут через пять я услышала плач. Я поднялась и увидела, как телохранитель тащит раненого Вахо Ибрагимова.

До меня еще не доходило, отчего кругом так пусто, почему все куда-то исчезли. Вдруг увидела Мусу: он держал на коленях голову Джохара. По лицу я поняла, что муж умирает. Я ощупала его с ног до головы: тело было в целости. И только в голове, на затылке, зияла рана.

Ребята действовали очень быстро. Сначала они вынесли Дуки. Вахо пострадал меньше, поэтому его пока оставили. Мы спустились в деревню, к дому, где остановились. Положили Джохара на диван. В комнату никого не впускали из опасения, что печальное известие окажется чересчур болезненным. Парни молодые, горячие, они могли слепо броситься мстить, и это бы их погубило.

Правда, как только мы ушли с места происшествия, началась ужасная атака бомбардировщиков. Они лютовали часа два.

Ночью мы перебрались в другое место. Там был только один старик, его звали Амхат. Он сразу предупредил, чтобы я никому не проговорилась о случившемся, что Дуки мертв, чтобы ни одной слезинки не проронила. Жена у Амхата была очень слаба, не выдержало бы сердце.

Мне тогда вспомнились все старушки, сидевшие на митингах прямо на снегу с портретами Дудаева в руках, и все те, кто любит его, кому он дорог. Я поняла, что это известие было бы для них очень опасным. Они были не так сильны, как молодые.

Я просидела возле него два дня. Люди звали меня попить чаю, поесть. Рассказывали, что погибли другие, а Дудаев жив, только ранен. Я отвечала: "Да, да, конечно", — и старалась сдержать слезы, не в силах сказать им страшную правду. На третий день проститься с ним пришли военные командиры. И они... Я находилась в соседней комнате и все слышала.



Один из последних снимков Д. Дудаева.

Потом мне пришлось участвовать в трех пресс-конференциях, надо было засвидетельствовать смерть нашего президента. Я уже научилась держать себя в руках. Поняла, что тем самым я оставляю людям надежду, они не поддадутся чувству мести и не погибнут понапрасну.

— Вы человек православный. Как вы относитесь к исламу?

— Я долго была атеисткой, так меня воспитывали. Долгие годы жила без веры, хотя в глубине души какая-то вера все же была. Мне всегда было страшно от одной только мысли, что со смертью все кончается. Со временем мой личный опыт все более обогащался такими фактами, которые житейской логикой никак не объяснишь. Постепенно я стала понимать, что существует некая Высшая сила, управляющая нашими судьбами.

Мою веру укрепила война. Она укрепила в вере всю нашу молодежь. Даже те мальчишки, которые раньше легкомысленно относились к религии, на войне стали молиться, совершенно бросили пить. Война очистила их души, они победили, потому что были едины.

— Вы рассказали о чеченцах. А что могли бы сказать о русских солдатах?

— Думаю, что эта война повергла их в еще большее отчаяние, ибо их отправили на неправедное дело. Конечно, в тех, кто отказался стрелять, проснулась совесть. Они и в бой шли, опустив автоматы и головы, но ведь за их спинами шли вооруженные офицеры. Этим-то не суждено услышать голос совести.

Я вспоминаю кадры, показанные по Российскому телевидению, когда один православный священник, въехавший с российскими солдатами в Грозный и увидевший тысячи убитых, напутствовал солдат так: "Российская армия, бей отступников!"

В душе российского солдата все перепуталось, ему трудно сочетать религию с законами своего государства.

Даже здесь, в Вильнюсе, проходя однажды мимо церкви, я услышала, как какой-то пьяница жаловался, что одного брата потерял в Афганистане, а другой воюет в Чечне. Зачем же нужен христианский Бог, вопрошал он. Вот так в России губят человеческие души, высокую духовность. Русским людям просто не во что верить, поэтому они гораздо несчастнее нас.

— Джохар Дудаев молился?

— Он молился так, как того требуют мусульманские обычаи. Делал это ежедневно. Утром, вечером, после обеда, по мере возможности.

Раньше, когда он был генералом советской армии, он не молился, его вера не была сильна. Став президентом, он стал видеть знамения и помощь свыше. Каждый раз он принимал все это с вниманием и благодарностью.

— Что вы думаете о признании независимости Чечни в международном масштабе?

— Уже пять лет мы считаем себя свободными. Чеченцы по природе своей очень гордый народ, не склонный ни у кого ничего просить. Думаю, что мы так же будем чувствовать себя свободным народом до конца света, даже если нас никто не признает. Хотя, конечно: нам очень хотелось бы, чтобы мир нас признал.

При президенте З.Гамсахурдиа к нам особенно благоволила Грузия, за что мы очень благодарны грузинскому народу. С приходом В.Ландсбергиса к власти тоже связываем большие надежды. Я помню, как он зачитывал в Сейме заявление протеста против войны в Чечне, как он вышел из зала со всеми своими единомышленниками.

Мы всегда ощущали поддержку литовского народа, знали, что большинство литовцев — за независимость Чечни. И, конечно, надеемся, что Литва признает нас первой.

— Как вы живете сейчас, чем занимаетесь?

— В декабре я в качестве почетного гостя была приглашена в Польшу, где прошел "круглый стол", посвященный проблемам кавказского региона, отчасти и нашей Ичкерии. Дома пишу картины, часто даю интервью.

— А где теперь ваш дом? Можете ли вы сказать об этом вслух?

— У меня есть несколько таких мест, но конкретно сказать не могу. Я живу и в Польше, и в Турции, и на Украине, и в странах Балтии.

Повсюду у меня есть друзья, повсюду я чувствую себя как дома.

Аллу Дудаеву расспрашивал Вайдотас ЖУКАС.

Задумаемся...

КАМПРАМАТ

Хто і як яго выкарыстоўвае

Чацвёртага снежня 1996 года некаторыя мінскія газеты апублікавалі выказванні старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Тамары Віннікавай. Каменціруючы перамовы з місіяй Міжнароднага валютнага фонду (МВФ), яна сказала журналістам: "Пора перестать рассматривать МВФ как идеологически чуждого нам оппонента, проводника западных экономических моделей". І далей: "...Во время кампании по проведению референдума было проведено чрезвычайное заседание с участием премьер-министра, руководителя Администрации президента, министров финансов и экономики, где Национальный банк в ультимативной форме отказался осуществить денежную эмиссию". (Чытач, напэўна, памятае, як Аляксандр Лукашэнка, імкнучыся любой цаной выйграць рэферэндум, павышаў заработную плату некаторым сацыяльным праслойкам, раздаваў ільготы, на што патрэбны былі вялікія грошы.)

Прачытаўшы гэтыя выказванні Віннікавай, адзін мой знаёмы, які актыўна і аналітычна сочыць за пульсам палітычнага арганізма Беларусі і беспамылкова на некалькі хадоў наперад вызначае, як сыграе ў кожнай партыі Лукашэнка, сказаў мне: "Памятай, песенка Віннікавай спета! Яе з трэскам убяруць, бо яна парушыла галоўны запавет згрэі: не падпарадкавалася яе важаку, ды яшчэ "ва ультыматыўнай форме", гэта значыць не прызнала яго аўтарытэт".

Роўна праз сорак дзён грымнуў гром. Адсвяткаваўшы Новы год і Каляды, вытрымаўшы паўзу, 14 студзеня Лукашэнка сваім указам вызваляе Віннікаву з пасады старшыні Нацыянальнага банка, і яе бяруць пад стражу.

Напэўна, нейкія грахі ў Віннікавай ёсць, і пра гэтыя грахі, вядома ж, ведаў Лукашэнка. Ведаў, але ж настойліва, насуперак волі многіх дэпутатаў Вярхоўнага Савета, прызначыў яе, маладую і яшчэ малавопытную, галоўным банкірам. Усё было ў ажуры, усё было шыта-крыта да таго часу, пакуль Віннікава па-жаночы паслухмяна і бездакорна выконвала волю свайго высокапастаўленага патрона. Але як толькі яна заняла прынцыповую дзяржаўную пазіцыю, аб'ектыўна ацаніла дзейнасць Міжнароднага валютнага фонду, з якім у Лукашэнкі нязгода, не падпарадкавалася выканаць загад пусціць у абарачэнне пустыя грошы, з жалезных шафаў быў выняты пакрыты пылам кампрамат на яе.

А памятаеце скандал з вызваленнем ад пасады старшыні Нацыянальнага банка Станіслава Багданкевіча — прафесіянала высокай пробы. Памятаеце, як прэзідэнт трэс стосам папер на трыбуне перад парламентарыямі, гразіўся пасадзіць Багданкевіча ў турму, але як ні стараўся, нічога не атрымалася. Атрымаўся пшык, як і з той антыкарупцыйнай камісіяй. Прафесар Багданкевіч аргументавана, лагічна, паслядоўна паказаў і даказаў, што Аляксандр Рыгоравіч мала што кумекае ў банкаўскай справе і прадказаў, што такая некампетэнтнасць прэзідэнта можа дорага каштаваць Беларусі і яе народу. Скандала з Багданкевічам не атрымалася. Наадварот, аўтарытэт яго як прафесіянала і сумленнага чалавека намнога вырас.

Кампрамат, тайнае дасье на людзей, громкія скандалы — выпрабаваная зброя многіх палітычных правадыроў. Перад тым як развязаць другую сусветную вайну, Адольф Гітлер змясціў са сваіх пастоў галоўнакамандуючага сухапутнымі войскамі фельдмаршала Бломберга і начальніка штаба генерала Фрыцэ, якія не ў поўнай меры падзялялі агрэсіўныя погляды фюрэра.

У 1938 годзе Бломберг ажаніўся з нейкай Эрне Грун. На вяселлі прысутнічалі Гітлер, Герынг і другія фашысцкія заправілы. Хутка пасля вяселля Герынг "дакументальна паказаў", што Эрне Грун была прастытуткай. Гітлер ведаў аб гэтым яшчэ да вяселля, але падштурхоўваў Бломберга да жаніцьбы, каб потым расправіцца з нелаяльным фельдмаршалам. А каб скампраметаваць і звольніць Фрыцэ, гестапа, па заданню Герынга, далажыла фюрэру, што той гомасексуаліст, што было няпраўдай.

Спрактыкаваным інтрыганам з езуіцкімі прыёмамі быў горача любімы правадыр савецкіх людзей Іосіф Сталін, за якога ў час выбараў галасавалі пагалоўна ўсе выбаршчыкі. Усё сваё жыццё на пасту генсека ЦК ВКП (б) ён правакаваў судовыя працэсы над сваімі палітычнымі праціўнікамі, паплечнікамі і простымі сумленнымі людзьмі.

Кампрамат — выпрабаваны сродак Лукашэнкі для барацьбы з апазіцыяй і ўтаймавання свайго акружэння, кіраўнічых кадраў, якія, будучы ў масе сваёй прыстойнымі і сумленнымі людзьмі, маўкліва не падзяляюць яго палітыку па разбурэнню нашай кволай нацыянальнай дзяржаўнасці і да якіх ён адносіцца з падазрэннем і недаверам.

Лукашэнка не аднойчы скардзіўся, што ён адчувае кадравы голад, што ў нас няма здольных людзей. Былы дырэктар саўгаса, заняўшы пасаду прэзідэнта, сігануўшы адразу на вышэйшы дзяржаўны трон Беларусі, не можа разгледзець у велізарным моры дыпламаваных людзей тых, хто нароўні з ім мог бы "паруліць" нашай маладой дзяржавай! Не ведаю ніводнага чалавека ў Беларусі, хто б так фанабэрна ацэньваў сябе і так зняважліва і здзекліва выказваўся пра сваіх суайчыннікаў. У нас ёсць тысячы, дзесяткі тысяч таленавітых 30—40-гадовых эканамістаў, фінансістаў, юрыстаў, палітолагаў, інжынераў, з якіх можна сфарміраваць не адну каманду па ўсёй вертыкалі знізу да верху, здольную аптымальна, з найменшымі выдаткамі перавесці беларускую сацыялістычную планавую эканоміку на рэйкі цывілізаванага рынку. Але гэтыя людзі ні за якія грошы не пойдуць на службу да Аляксандра Рыгоравіча, а другія пры пэўных акалічнасцях маглі б пайсці да яго, аднак ён ім не давярае, ён іх баіцца. Моладзь — не саюзнік прэзідэнта!

Ён робіць стаўку на сваіх вернападданых, але не заўсёды добрых прафесіяналаў, магілёўскіх землякоў і на кадры ўчарашняга дня, на былую партнаменклатуру, аб'яднаную партыйнай дружбай, выхаванай на псіхалогіі карпаратыўнасці і кругавой парукі. "Бацька" зноў перадаў руль кіравання пасівелым, але дысцыплінаваным былым высокім партыйным тузам — Малафееву, Лінгу, Антановічу і другім, хто ўжо раней выпрацоўваў і пракладваў "генеральную лінію" і вёў нас "выпрабаванай і вернай ленінскай дарогай да ззяючых вяршынь камунізму".

Ёсць у акружэнні прэзідэнта і людзі маладзейшыя, больш здольныя для працы ва ўмовах рынку, але яны не прайшлі партыйнай загартоўкі і ненадзейныя. У знак нязгоды з палітычным курсам Лукашэнкі стукнуў дзвярыма прэм'ер Міхаіл Чыгір, не стаў на шлях парушэння закона Генеральны пракурор Васіль Капітан і таксама добраахвотна напісаў заяву аб уходзе са сваёй пасады. Пры нявысветленых да канца абставінах страцілі свае пасады міністр абароны Мальцаў і іншыя высокапастаўленыя асобы.

На другі дзень пасля адстаўкі Чыгіра некаторыя газеты паведамілі, што ў трох яго намеснікаў быў таксама намер салідарызавацца з прэм'ерам і пайсці ў адстаўку, але іх уламалі застацца, бо без іх усё рухнула б. А тут яшчэ і фаварытка Тамара Віннікава жорстка не падпарадкавалася! Такую здраду Аляксандр Лукашэнка не мог ёй дараваць, і яна апынулася ў ізалятары КДБ. На яе прыкладзе ён хоча правучыць другіх, тых, хто застаўся ў яго камандзе і хто патэнцыяльна можа ў крытычную хвіліну таксама здрадзіць свайму босу.

Улічваючы буйны нораў Аляксандра Рыгоравіча, з вялікай доляй верагоднасці можна дапусціць, што і другіх неслухаў не пакінуць у пакоі і будуць збіраць кампрамат. Ну, напрыклад, чаму не ўкусіць Міхаіла Чыгіра за тое, што ў таго, здаецца ў Капыльскім раёне, 30 ці 50 вулляў? На што яму столькі? Каб спекуляваць мёдам, грэбці дармавыя грошы, узбагачацца? Ды і кіраўніком Аграбанка быў Чыгір у Мінску, напэўна, крэдыты выдаваў другім і сам браў?

Васіля Капітана ўжо кусаюць, дробненька, "мелкотравчато", несалідна. Памятаеце той дзень, калі Дзяржсакратар Савета бяспекі Віктар Шэйман, гэты шэры кардынал, які трымае ў сваім кулаку ўсе сілавыя і карныя органы краіны і сканцэнтраваў у сваіх руках большую ўладу, чым колішні другі сакратар ЦК КПБ, абвінаваціў былога Генпракурора, які зараз працуе адвакатам, у тым, што Капітан стаў на абарону грамадзяніна Ізраіля, бізнесмена Ф., які вырабляў і прадаваў спірт у Беларусі. Не ведаю, чым незадаволены таварыш Шэйман? Васіль Капітан зараз не пракурор, а адвакат, і абавязак адваката абараняць у межах закону людзей, нават самых закаранелых злачынцаў. Для гэтага і створана адвакатура.

У адным інтэрв'ю на пасадзе генпракурора Васіль Капітан гаварыў, што летам у час водпуску паедзе ў вёску ў Драгічынскі раён і дапаможа маці нарыхтаваць сена для каровы. Няхай Шэйман праверыць, можа, Капітан выкасіў большую дзялку, чым яму адвялі, можа, у калгаснае залез і разбазарыў сацыялістычную маёмасць?

Тым часам следчыя вядуць допыты Тамары Віннікавай, яе справа трымаецца ў глыбокай тайне, і грамадскасць мала што ведае, як ідзе следства. У такіх умовах у ход ідзе фальклор.

Знаёмыя матывы, прывычныя словы: напусціць паболей туману, намякнуць, зрабіць таямніча-глыбокадумны жэст! "Вялікі-вялікі ланцужок вельмі высокіх службовых асоб" ужо выцягваў Аляксандр Рыгоравіч са сваёй славутай антыкарупцыйнай камісіяй. Стаўшы прэзідэнтам, пагражаў карай Кебічу за нейкія махінацыі ў "асабліва буйных памерах" і Шушкевічу за "фарбу і цвікі" для сваёй дачы, і былому міністру Захаранку за тое, што нешта не тое будаваў і купляў для міліцыі. Турмы нашы перапоўненыя дробнай сошкай (тут Беларусь першая ў Еўропе), а з высокіх, не "от мира сего", прэзідэнт нікога не пасадзіў — і не пасадзіць. Скандалы і "выкрыванні" патрэбныя Лукашэнку для падтрымання адпаведнага псіхозу ў грамадстве і свайго іміджу "бескампраміснага барацьбіта за шчасце народнае". Без пастаяннай "подпитки" гэты імідж хутка блякне, вяне і сохне. Я ўсё больш умацоўваюся менавіта ў такой думцы.

Мікола ЯРМАШЭВІЧ.
Брэст.

Месца сустрэчы — Мінск

Беларуска-германскія кантакты будуюцца на аснове ўзаемных інтарэсаў. Гэта з новай сілай заклікана прадэманстраваць традыцыйная сустрэча прадстаўнікоў дзелавых колаў нашай рэспублікі і нямецкіх зямель Паўночны Рэйн-Вестфалія і Брандэнбург, якая намечана на 21 — 23 красавіка ў Мінску. Яе мэта — садзейнічаць пашырэнню і паглыбленню эканамічнага і гандлёвага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі, падтрымаць дзейнасць сярэдняга і малога бізнесу.

Удзельнікі сустрэчы падрабязна даведаюцца аб мытных правілах у Беларусі, абмяркуюць праблемы, звязаныя з пастаўкамі тавараў і ўкладаннем інвестыцый. Акрамя таго, у рамках мерапрыемства адбудзецца кантактна-кааперацыйная біржа беларускіх і германскіх прадпрыемстваў, а таксама пройдзе прэзентацыя кнігі "Галіновы партрэт Рэспублікі Беларусь", выдадзенай на нямецкай і рускай мовах.

Валянціна МЕНШЫКАВА.

Крымінал

Давялі свінні да... турмы

Шырокі рэзананс атрымаў у Навагрудскім раёне прыгавор мясцовага суда па справе аб групавым крадзяжы жывёлы ў калгасе імя Леніна. Выкарыстаўшы тое, што ферма ў вёсцы Лозкі не ахоўвалася, злачынцы менш чым за год выкралі 15 свіней. Нанесены гаспадарцы ўрон склаў звыш 25 мільёнаў рублёў.

Прабіраліся зладзеі на ферму праз акно і, як правіла, ноччу. Мяса ж яны прадавалі на рынках суседняга Лідскага раёна і Мінска. Усе члены гэтай групоўкі злаўмыснікаў — блізкія сваякі і жыхары адной вёскі Падкасоўе. Затрымалі іх з доказамі злачынства.

Адзін з арганізатараў крадзяжоў Аляксандр Пляскач, раней ужо судзімы, атрымаў 10 з паловай гадоў турэмнага зняволення, яго саўдзельнікі — Уладзімір Лысоўскі, Іван Жук і Іван Адамовіч — ад 2 да 5 гадоў. А яшчэ двое — Тацццяна Пляскач і Васіль Жук — трапілі пад амністыю.

З валютчыкамі ў Лідзе не жартуюць

За незаконныя валютна-абменныя аперацыі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці Анатоль Аляксеенка з Ліды. Рашэннем мясцовага суда ён прыгавораны да двух гадоў абавязковага прыцягнення да працы на аб'ектах народнай гаспадаркі. Такая мера пакарання была вызначана пасля таго, як валютчык, заплаціўшы некалькі штрафаў, усё ж працягваў сваю "фінансавую" дзейнасць.

Кантралюючы выкананне Дэкрэта прэзідэнта "Аб мерах па забеспячэнню парадку пры ажыццяўленні валютна-абменных аперацый", праваахоўныя органы горада выявілі дзесяткі іншых парушальнікаў. Многія прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці і заплацілі штрафы, на некалькіх чалавек накладзены адміністрацыйны арышт.

Канстанцін БАЛАТЭВІЧ.

Мытнікам прыйшлося прымяніць зброю

Супрацоўнікам мытні "Заходні Буг" упершыню ў практыцы сваёй работы прыйшлося прымяніць табельную зброю: выстраліць па колах аўтобуса, вадзіцель якога спрабаваў ухіліцца ад кантрольнай праверкі. Як затым высветлілася, у аўтобусе знаходзілася паўтоны безакцызнага спірту, які кантрабандыст з Брэста хацеў незаконна ўвезці на тэрыторыю вобласці.

Дарэчы, такія "ўловы" ў супрацоўнікаў мытні сталі апошнім часам даволі частымі. Штодзённа на беларуска-ўкраінскім участку граніцы яны затрымліваюць кантрабандны бензін, спіртное, цукар. Напрыклад, нядаўна на аб'язной дарозе ў Маларыцкім раёне быў спынены грузавік, у якім знаходзілася адразу 20 тон цукру.

Іван КУКСА, БелТА.

Хроніка здарэнняў

А ў вас у кватэры газ?

11 красавіка позна вечарам у адным з дамоў па вуліцы Веры Харужай у Мінску адбыўся выбух. Прычынай стала ўцечка газу ў кватэры, гаспадыні якой, на шчасце, у гэты момант дома не было. Ніхто не пацярпеў і ў іншых кватэрах, а ў чатырох з іх толькі пашкоджана шкло. Выбіта шкло і ў пад'ездзе. А ў кватэры, дзе адбыўся выбух, пашкоджанні значныя.

Снарады абясшкоджаны

На тэрыторыі садаводчага таварыства "Крыніца" каля вёскі Зацень-2 Мінскага раёна знойдзены снарад часоў Вялікай Айчыннай вайны. Зусім нядаўна такі ж снарад быў вынесены з гаража жыхара вёскі Семкава гэтага ж раёна. Смяротныя знаходкі абясшкоджаны, але не выключана магчымасць, што яны не апошнія, асабліва ў перыяд вясенніх палявых работ. Сапёры папярэджваюць: будзьце вельмі ўважлівыя і асцярожныя.

Зноў мужчына і жанчына

Вялікае адзінства мужчынскай і жаночай палавін складае сэнс і прыроду жыцця. Але вядома, што класічны дуэт — мужчына і жанчына — сее не толькі разумнае, добрае, вечнае, але і параджае звычайныя бытавыя трагедыі. Гэта адбылося недалёка ад Полацка, дзе ў прыватным гаражы ў легкавой машыне з прыметамі атручэння ўгарным газам былі знойдзены трупы аўтаўладальніка і маладой палачанкі. Загінуўшы — вадзіцель-прафесіянал — абавязаны быў ведаць, што закрытыя гаражныя сустрэчы ў аўтамабілях з працуючымі рухавікамі вельмі небяспечныя для жыцця.

Сяргей ЦІВАНАЎ, БелТА.

У чэргах за валютай – прафесійныя пакупнікі

Узмацненне барацьбы з нелегальнымі валютнымі аперацыямі прынесла даволі нечаканы эфект. У Мінску большасць прафесійных валютчыкаў знаходзяцца ў падполлі, аднак свой бізнес яны не спынілі. Іх месцы каля абменных пунктаў занялі... пенсіянеры, студэнты і беспрацоўныя. За пакупку адной стодоларавай купюры ценявыя банкіры плацяць сваім добраахвотным агентам ад 50 да 100 тысяч беларускіх рублёў. І для таго, каб зарабіць гэтыя грошы, часам прыходзіцца адстаяць у чарзе не адну гадзіну.

Уладзіслаў ПЛАТУН, БелТА.

Цукрам і ўгнаеннямі зоймецца камісія

Шляхі вырашэння праблем, што накапіліся ў двухбаковых адносінах паміж Беларуссю і Кубай, прадугледжваецца абмеркаваць у час пасяджэння сумеснай камісіі па гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву. Як стала вядома карэспандэнту БелТА, яно адбудзецца ў Мінску 22—23 красавіка.

Члены камісіі прааналізуюць развіццё дагаворна-прававой базы, стан і перспектывы экспартна-імпартных аперацый, магчымасці чарговай пастаўкі ў рэспубліку цукру-сырцу, а на Кубу — калійных угнаенняў. У парадак дня ўключаны і пытанні па рэгістрацыі ў нашай дзяржаве прадукцыі фармацэўтычнай прамысловасці Кубы, а таксама аб наладжванні больш цесных кантактаў паміж свабоднымі эканамічнымі зонамі абедзвюх краін.

Міхаіл ЖУРАВОВІЧ, БелТА.

Дзякуй!

Пакуль у Слуцку жыве Аляксандр Катляроў — там заўсёды будзе "Народная воля"

З ім мы часцяком сустракаемся ў горадзе, і кожны раз я прыгадваю халодную, снежную зіму 1996 года, калі Аляксандр Пятровіч Катляроў амаль штодня раніцой прыходзіў да Дому кнігі ў самым цэнтры Слуцка з кіпай свежых экземпляраў "Народнай волі". Прыходзіў у дваццаціградусныя маразы, завеі і дажджлівае надвор'е, выслухваў зневажальныя кпіны зачумленых на "саўковых" талмудах пенсіянераў, каго слова "незалежнасць" і сёння прыводзіць у шаленства. Але часцей ён чуў словы ўдзячнасці за смеласць, бескарыслівасць, бо на сваім "бізнесе" заробак меў небагаты.

Як вядома, у лістападзе 1995 года дастаўку газеты па пошце замяталіны забаранілі, і сотням гарадскіх падпісчыкаў паштальёны разнеслі квіткі на грашовую кампенсацыю, у тым ліку і аўтару гэтых радкоў. Аляксандру Пятровічу — таксама. І ён стаў дастаўляць з Мінска па 250—300 экземпляраў газеты. Калі замярзаў — падмяняла жонка Валянціна. Неўзабаве амаль усе падпісчыкі змаглі рэгулярна, за рэдкімі перапынкамі, купляць любімую газету. А Аляксандр Пятровіч з новай кіпай у нядзелю спяшаўся на дызель-поезд і ехаў у Салігорск. Частку тыражу прадаваў у вагонах, рэшту — на прывакзальнай плошчы Салігорска. І так — да канца красавіка мінулага года, пакуль пад націскам грамадскасці Мінска ўлады, нарэшце, не адмянілі драконаўскай забароны на распаўсюджванне газеты.

Тыя вулічныя "ўрокі" Аляксандра Пятровіча для пэўнай групы случчан пайшлі на карысць — яны сталі падпісчыкамі на "Народную волю".

Хто ж ён, ваш шчыры сябра? Былы афіцэр Савецкай Арміі. Беларус, родам з Гомельшчыны, з сялянскай сям'і. Адслужыўшы 27 гадоў, выйшаў у адстаўку. У 11-м вайсковым гарадку Слуцка атрымаў кватэру, жонка ўладкавалася метадыстам-выхавацелькай у дзіцячым садку. Адзіная іх дачка ўжо замужам.

У тым гарадку за пасляваенныя гады вырас вялікі жылы мікрараён. Не меней як на тры чвэрці яго засялілі былыя вайскоўцы, нямала сярод іх выхадцаў з Расіі, каго "великая и неделимая" пасля заканчэння службы не пацягнула на сталае жыхарства. Ад іх, ад манкуртаў з ліку беларусаў, Аляксандр Пятровіч, калі прадаваў на вуліцы "Народную волю", не раз чуў словы-стрэлы ў спіну: "Вон пошел бэнээфовец". Даводзілася выслухваць знявагі і пагрозы па тэлефоне. Але ён не з баязлівага дзесятку. Аб "ідэйнай" загартоўцы большасці жыхароў гарадка, у якім пражывае адзінаццаць тысяч чалавек, сведчыць хоць бы такі факт: толькі чатыры экземпляры "Народнай волі" дастаўлялі туды паштальёны ў першым квартале ды дзесяткі з два распаўсюджвалася праз адзіны газетны шкапік. Затое не залежваюцца ў ім "Правда", "Товарищ", "Советская Белоруссия", "Во славу Родины"... Што ж, яшчэ вялікі Гогаль у свой час пісаў: "Хто ўжо кулак, таго не разагнуць у далонь".

На днях Аляксандр Пятровіч падзяліўся са мною радасцю: яго сямімесячная ўнучка пачала гаварыць. Навіна з прыемных, як і тое, што на кніжнай паліцы ў Катляровых паявіліся купленыя ў Доме кнігі "Тлумачальны слоўнік беларускай мовы" і трохтомны "Руска-беларускі слоўнік". Вырашылі з жонкай дасканала авалодаць падзабытай за гады службы матчынай мовай. А слоўнікі з цягам часу перададуць дачцы, зяцю, унучцы — каб і яны не забывалі яе ніколі.

Міхась ТЫЧЫНА.
г.Слуцк.

Навіны з Літвы

Даўжнікі будуць працаваць пры свечках

Каля 16 тысяч спажыўцоў электраэнергіі ў Літве безнадзейна завінаваціліся энергетыкам. Агульная сума даўгоў набліжаецца да паўмільярда літаў. Асабліва вялікімі даўжнікамі сталі прадпрыемствы і ўстановы дзяржаўных органаў мясцовага самакіравання. Каб нармалізаваць сітуацыю ў гэтай сферы, літоўскі ўрад мае намер прымаць адпаведныя санкцыі.

У прыватнасці, калі арганізацыя не разлічваецца за зрасходаваную электраэнергію, АТ "Летувас энергія" мае права адключыць даўжніка ад электрасетак. Такім чынам, напрыклад, днямі былі пакараны прадпрыемствы Вільнюса і Каўнаса, якія забяспечваюць вулічнае асвятленне. У гарадах цемра, што выклікала сапраўдны гнеў у гараджан, а таксама хвалю крытычных выступленняў у сродках масавай інфармацыі. Аднак такі жорсткі крок энергетыкаў аказаўся вельмі эфектыўным — даўжнікі пачалі ў тэрміновым парадку плаціць па рахунках.

Рост цэн у Літве справакавалі... медыкі

Як вядома, вынікам перадзабастовачных акцый, арганізаваных медыкамі Літвы ў канцы мінулага года, стала абяцанне ўрада пачаць з 1 мая 1997 года павышэнне ім зарплаты і давесці яе да ўзроўню іншых бюджэтных арганізацый. Каб выканаць гэтае абяцанне ва ўмовах невыканання бюджэту, было вырашана павысіць з 15 красавіка на 40 працэнтаў акцыз на продаж бензіну, алкаголю і тытунёвых вырабаў.

У выніку адзін літр бензіну падаражаў на 2-2,5 літа і цяпер ужо на самай справе каштуе як у Еўропе — каля 0,5 долара. Сур'ёзны ўдар нанесены і па кішэнях курцоў. Прычым адразу ж намеціўся рост цэн і на іншыя тавары шырокага спажывання.

Альгімантас БРАЗАЙЦІС, БелТА.

Из семейного альбома

Еще неизвестный Федута...

1986 год, Гродненская область, Поречье. Профильный пионерский лагерь "Наука". Летом того года выпускник филологического факультета Гродненского государственного университета **Александр ФЕДУТА** (на снимке — в очках) преподавал русский язык и литературу в отряде гуманитариев.

А так веселились ребята после занятий...

Сегодня Александр Федута — известный публицист.

Адным абзацам

